# АБАРОНА ДЫСЕРТАЦЫЙ

## ДЫСЕРТАЦЫІ ПА ГІСТАРЫЯГРАФІІ, КРЫНІЦАЗНАЎСТВЕ І МЕТАДАХ ГІСТАРЫЧНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ, ДАКУМЕНТАЛІСТЫЦЫ, ДАКУМЕНТАЗНАЎСТВЕ І АРХІВАЗНАЎСТВЕ, АБАРОНЕНЫЯ Ў БЕЛАРУСІ Ў 2010—2011 гг.

За перыяд з верасня 2010 г. па чэрвень 2011 г. у Беларусі было абаронена пяць кандыдацкіх дысертацый па спецыяльнасці 07.00.09 і адна — па спецыяльнасці 05.25.02. Гэта прыблізна адпавядае колькасці дысертацый, абароненых за папярэдні перыяд. Па трох дысертацыях рашэнні саветаў па абароне дысертацый былі зацверджаны, тры дысертацыі знаходзяцца на разглядзе ў ВАК.

У савеце па абароне доктарскіх дысертацый пры БДУ Д 02.01.05 было абаронена пяць дысертацый, у савеце па абароне доктарскіх дысертацый пры БДПУ імя Максіма Танка К 02.21.03 — адна. У саветах пры ІГ НАН Беларусі і пры ГрДУ імя Янкі Купалы дысертацыі па названых спецыяльнасцях не абараняліся. Па дзве дысертацыі былі падрыхтаваны ў БДУ і БДПУ імя Максіма Танка, па адной — у РІВШ і БелНДІДАС. Па трох дысертацыях навуковае кіраўніцтва ажыццяўлялася дактарамі навук, па дзвюх — кандыдатамі навук, адна дысертацыя была абаронена без пазначэння навуковага кіраўніка. Адметным можна назваць склад апаніруючых арганізацый — тройчы такой установай быў МДУ імя А. Куляшова, па адным разе — ГрДУ імя Янкі Купалы, БелНДІДАС, БДУКіМ. Афіцыйнымі апанентамі выступалі навукоўцы БДУ, ІГ НАН Беларусі, ГДУ імя Ф. Скарыны, БДПУ імя Максіма Танка, ГрДУ імя Янкі Купалы, РІВШ, некаторых іншых устаноў. Замежныя навукоўцы для апаніравання не запрашаліся.

Тэматычна структура абароненых дысертацый адпавядае практыцы папярэдніх гадоў — большасць з іх выкананы па гістарыяграфіі, асобныя — па крыніцазнаўстве. Дысертацыі па метадах гістарычнага даследавання не абараняліся.

### 2010 г.

**Косаў Аляксандр Пятровіч.** Знешняя палітыка ЗША другой паловы XX — пачатку XXI ст. у постсавецкай расійскай гістарыяграфіі / англ. — The US foreign

policy of the second half of the 20th — 21st centuries in Post-Soviet Russian historiography.

***Навуковы кіраўнік*:** д-р гіст. навук, прафесар У. С. Кошалеў.

Даследаванне было скіравана на раскрыццё зместу і сутнасці постсавецкай гістарыяграфіі знешняй палітыкі ЗША другой паловы XX — пачатку XXI ст. на падставе выяўлення яе вядучых тэндэнцый і асаблівасцей.

**Казленка Аляксей Уладзіміравіч**. Кельтыберскія тэсэры гасціннасці як гістарычная крыніца (II в. да н. э. — I в. н. э.). / англ. — Celtiberian tesseras of hospitality as a historical source (II BC — I AD).

***Навуковы кіраўнік*:** канд. гіст. навук, дацэнт В. І. Ханкевіч.

У працы вызначана паходжанне кельтыберскіх тэсэр гасціннасці, выяўлены асноўныя характарыстыкі гэтых дакументаў, параметры, фактары і накіравасць іх змен. На аснове аналізу дадзеных надпісаў на тэсэрах раскрыты асноўныя рысы інстытута кельтыберскай гасціннасці, вызначаны ўдзельнікі і нормы пагаднення, знойдзены прадпасылкі і характар эвалюцыі гэтага інстытута. Выяўлена сувязь паміж трансфармацыяй кельтыберскіх тэсэр, змяненнем структуры і зместу выгравіраваных на іх тэкстаў пагадненняў і пераходам норм гасціннасці да адносін патраната-кліентэлы ў правінцыяльна-рымскі перыяд.

### 2011 г.

**Забельнікава Вольга Васільеўна.** Фарміраванне сінкрэтычнай цывілізацыі ў Лацінскай Амерыцы: расійская гістарыяграфія праблемы / англ. — The formation of syncretic civilization in Latin America: Russian historiography of the problem.

***Навуковы кіраўнік*:** д-р гіст. навук, прафесар У. С. Кошалеў.

Упершыню ў айчыннай гістарычнай навуцы зроблены комплексны аналіз навуковай спадчыны савецкай школы лацінаамерыканістыкі, а таксама сучасных канцэпцый расійскіх даследчыкаў, якія закранаюць асаблівасці фарміравання сінкрэтычнай цывілізацыі Лацінскай Амерыкі, этнакультурных і рэлігійнага фактараў яе станаўлення як рэгіянальнай цывілізацыі. Дадзенае дысертацыйнае даследаванне запаўняе істотны прабел у гістарыяграфіі па адзначанай тэматыцы і падводзіць прамежныя вынікі станаўлення і развіцця расійскай лацінаамерыканістыкі.

**Сувалаў Алег Мікалаевіч.** Праблема этнагенезу беларусаў у гістарыяграфіі канца XVIII — пачатку XX ст. / англ. — The ethnogeny problem of the Belarussians in the historiography at the end of the XVIII — the beginning of the XX centuries, рус. — Проблема этногенеза белорусов в историографии конца XVIII — начала XX в.

***Навуковы кіраўнік*:** д-р гіст. навук, прафесар А. М. Люты.

На аснове даследавання гістарыяграфічных крыніц комплексна разгледжаны этапы развіцця поглядаў і канцэпцый этнагенезу беларусаў канца XVIII —

пачатку XX ст., прааналізавана развіццё крыніцазнаўчай базы даследаванняў этнагенезу беларусаў, ахарактарызаваны вялікаруская і польская канцэпцыі этнагенезу беларусаў, а таксама першая навуковая канцэпцыя этнагенезу беларусаў Я. Ф. Карскага, вызначаны падставы ўзнікнення названых канцэпцый, варыятыўнасць і дынаміка іх развіцця.

**Мельнікаў Ігар Вячаслававіч**[1]. Польская гістарыяграфіі этнасацыяльных працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў 1861—1914 гг. / англ. — Polish historiography of ethno-social processes on the territory of Belarus in 1861—1914, рус. — Польская историография этносоциальных процессов на территории Беларуси в 1861—1914 гг.

***Навуковы кіраўнік*:** прадстаўлена да абароны без пазначэння звестак аб навуковым кіраўніку[2].

Упершыню ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі ў выніку комплекснага аналізу прац прадстаўнікоў польскай гістарыяграфіі раскрыта тое, як польскія даследчыкі ў розныя перыяды вывучалі этнасацыяльныя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў 1861—1914 гг.

**Антановіч Зінаіда Васільеўна**[3]. Архівы Магілёўскай і Мінскай рымска-каталіцкіх кансісторый: гісторыя, структура, склад дакументаў (1782—1918 гг.) / англ. — Mohilev' and Minsk' roman-catholic consistories' archves: history, structure, content of documents (1782—1918 гг.), рус. — Архивы Могилевской и Минской римско-католических консисторий: история, структура, состав документов (1782—1918 гг.).

***Навуковы кіраўнік*:** канд. гіст. навук, дацэнт В. В. Гарбачова.

У працы характарызуецца арганізацыя архіўнай справы ў Магілёўскай і Мінскай рымска-каталіцкіх кансісторыях, даецца аналіз складу іх архіваў, раскрываецца крыніцазнаўчы патэнцыял раней малавядомых дакументаў. Вынікі даследавання адлюстроўваюць значнасць архіваў Магілёўскай і Мінскай рымска-каталіцкіх кансісторый для вывучэння айчыннай гісторыі ўвогуле і канфесіянальнай, у прыватнасці.

**А. М. Назаранка,** выкладчык кафедры крыніцазнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

---

[1] Прадстаўлена да абароны паўторна. У 2010 г. была абронена пад назвай «Сацыяльна-эканамічная гісторыя Беларусі перыяду капіталізму (1861—1914 гг.) у польскай гістарыяграфіі», але пасля адклікана пры разглядзе ў ВАК. Падрабязней — *Мельнікаў І. В.* Сацыяльна-эканамічная гісторыя Беларусі перыяду капіталізму (1861—1914 гг.) у польскай гістарыяграфіі: аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.09. Бел. дзярж. ун-т. Мінск, 2010.

[2] Па раней абароненай дысертацыі навуковым кіраўніком быў д-р гіст. навук, прафесар А. П. Жытко.

[3] Дысертацыя выканана па спецыяльнасці 05.25.02.